**УДК 821.161.**

# ГЕРОЯМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА: МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ГЕРАІЗМУ Ў РАМАНЕ А. САВІЦКАГА «ОБАЛЬ»

***М.А. КУРЫПКА***
***(Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт)***
***kuripych@gmail.com***

*У рамане «Обаль» А. Савіцкі апавядае пра самаддадзеную барацьбу падпольнай арганізацыі «Юныя мсціўцы» у гады Вялікай Айчыннай вайны. Звяртаючыся да тэмы змагання і самаахвяравання, пісьменнік шукае вытокі гераізму моладзі, якая паўстала на барацьбу з фашызмам. З глыбокім псіхалагізмам аўтар даследуе характары герoеў рамана, прыходзячы да высновы, што людзі толькі тады пачынаюць па-сапраўднаму цаніць жыццё, калі адчуюць боль, адчай і цяжар прыгнёту. Адзначана, што, А. Савіцкі, выкарыстоўваючы шырокія мастацкія сродкі, паказвае рэалістычную і праўдзівую вайну, што дазваляе ўбачыць, наколькі ярка могуць праявіць сябе гераічныя якасці ў трагічных экстрэмальных абставінах.*

***Ключавыя словы:*** *гераізм, Вялікая Айчынная вайна, беларуская літаратура, герой, ваенная проза*

**Уводзіны.** Вялікая Айчынная вайна пракацілася па Беларусі крывавым каткам, забраўшы жыццё кожнага трэцяга жыхара краіны. Такая трагічная з'ява не магла не адазвацца болем на старонках шматлікіх твораў, прысвечаных ваеннай тэматыцы. Пачынаючы з 40-х гадоў і да нашага часу гэта тэма застаецца актуальнай, нягледзячы на тое, што кропкі погляду ў літаратуры на вайну змяняліся калі не кардынальна, то шматзначна. М. Тычына справядліва адзначае, што «стаўленне да жыцця пісьменнікаў другой паловы 50-х − першай паловы 60-х і 70-х гадоў прыкметна адрозніваецца» [1, с. 3]. На сучасным этапе развіцця ваеннага рамана таксама вырысоўваюцца свае асаблівыя рысы. Як вынік, асэнсаванне вобраза гераічнага чалавека ў беларускай літаратуры змянялася пад уплывам часу і фарміраваннем у пісьменнікаў новага светаадчування, што сваім вобразным ладам адрознівалася ад літаратуры папярэдніх этапаў.

Ад самых першых твораў 40-х і 50-х гадоў беларуская літаратура прыняла рэалістычны накірунак, у якім пераважалі героіка-трагічныя матывы. Гераічны шлях развіцця ваеннай прозы лёгка прасачыць па творах К. Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа, І. Гурскага, А. Маўзона. Большасць літаратурных герояў вайны таго часу характызаваліся занадта паказной гераічнасцю і грамадскасцю, таму гераічны вобраз паўставаў больш кніжным, чым рэалістычным. В. Каваленка бачыць прычыну такога падыходу ў тым, што пісьменнік быў вымушаны змагацца ў барацьбе з дагматызмам і абмежаванасцю грамадскай думкі тых гадоў (пераклад наш. – *М.К.*) [2, с. 66]. З іншага боку С. Андраюк тлумачыць гэтую тэндэнцыю прычынамі этычнага характару: раны ад вайны былі яшчэ надта свежыя − было б жорстка адразу іх вярэдзіць [3, с. 65].

Якасныя змены ў адлюстраванні гераічнага вобраза адбыліся ў літаратуры ў другой палове 50-х гадоў. Гэта быў пачатак перыяду, які потым А. Адамовіч назаве рэнесансам іспаведальнай літаратуры, пранізанай жывым, палемічным пачуццём праўды і шчырасці (пераклад наш. – *М.К.*) [4, с. 83]. Герой твораў І. Навуменкі, В. Быкава, І. Чыгрынава. А. Адамовіча, А. Савіцкага і іншых пісьменнікаў ужо ня быў усярэдненым і адарваным ад рэальнага жыцця. Гэта быў чалавек са сваім унутраным светам, болем, перажываннем, няўпэўнены ці нават баязлівы. У ваеннай прозе матывы гераічнага пачалі цесна пераплятацца з катэгорыяй трагічнага, што стала надаваць новы колер існаванню подзвіга. Амаль кожны вобраз стаў насіць у сябе элемент трагічнага, бо гэта непасрэдна ўплывае на прыроду гераічнага, значна драматызуючы яе. І наогул катэгорыя гераічнага ў прозе аб вайне носіць, калі можна так сказаць, несамастойны характар, яна цесна звязана з катэгорыяй трагічнага і асобна ад яе не існуе [5, с. 58]. Так мяркуе В. Локун, падкрэсліваючы, што трагічнае надае аптымістычны характар гераічнаму, узмацняючы гэтую катэгорыю.

Беларуская ваенная проза стварыла больш за ўсё твораў, у якіх вайна разглядаецца праз прызму ўспрыняцця мірнага жыхара, для якога ў новых жыццёвых абставінах ўсё нова, які сам мусіць стаць іншым чалавекам і вымушаны змагацца з жорсткасцю і несправядлівасцю. Вобраз чалавека, які пад уплывамі абставін вымушаны па новаму пераасэнсоўваць жыццё і знаходзіць сілу, каб адкрыць глыбока ўнутры сябе вытокі асабістага гераізму, праходзіць праз раманы «Плач перапёлкі» (1972), «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужынцы» (1984) І. Чыгрынава, «Чужое неба» (1979), «Апошнія і першыя» (1968) Б. Сачанкі, «У падзямеллі» (1986) М. Аўрамчыка, «Позняе ворыва» (1963) А. Бажко, аповесці «Тартак» (1968) І. Пташнікава, «Знак бяды» (1983) В. Быкава, цыкл «Трывожнае шчасце» (1956–1963) І. Шамякіна. Праблема глыбокага і складанага маральнага выбару ў нечалавечых абставінах значна падкрэслівае героіка-трагічныя матывы у кожным характары.

А. Марціновіч, чыё дзяцінства прыпала на цяжкія ваенныя гады, расказвае аб убачаным і перажытым на вайне ў раманах «Не шукай слядоў сваіх» (1979), «Груша на Голым Полі» (1986) і аповесці «Няхай ідзе дождж» (1973). Увесь жыццёвы вопыт герояў дае магчымасць уявіць, як можа змяніцца духоўны стан чалавека пад уплывам экстрэмальных абставін, што можна набыць і што страціць. Да такога ж пакалення пісьменнікаў, што былі малымі сведкамі вайны, належыць В. Казько. Яго «Хроніка дзетдомаўскага саду» (1987) – гэта хроніка і ўласнага жыцця. На дакументальнай аснове грунтуецца і вобраз гераічнага чалавека ў публіцыстычнай кнізе А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі» (1975) ці аповесці С. Аляксіевіч «У вайны не жаночае аблічча» (1985). Пэўныя біяграфічныя звесткі дазваляюць глыбока раскрыць характар і духоўны свет чалавека, вымушанага змагацца за сваё жыццё. Да праблемы паводзін чалавека ва ўмовах ваеннага часу і адказнасці за свае ўчынкі і сумленне звярнуўся М. Чаргінец у рамане «Вам заданне» (1982).

На сучасным этапе беларуская ваенная проза не спынілася на здабытках мінулых дзесяцігоддзяў. П. Дзюбайла кажа, што ўжо 80-я гады сталі новым перыядам мастацкіх пошукаў, і сучасная літаратура, як ніколі раней, занята маральна-філасофскімі пошукамі, выяўленнем чалавечага фактара, духоўных каштоўнасцей асобнага чалавека і грамадства ў цэлым. [6, с. 176] Гэтыя тэндэнцыі ўласцівы і жанру ваеннай прозы. Пісьменнікі працягваюць паглыбляць свае пошукі вытокаў чалавечага гераізму з моцнай духоўнай і псіхалагічнай абгрунтаванасцю. У сваім апошнім рамане «Аперацыя «Кроў»» (2013) М. Чаргінец вызначае тыя межы, да якіх можа дайсці чалавек у сваёй жорсткасці. А. Савіцкі ў рамане-споведзі «Пісьмо ў рай» (2011) закранае праблему мінулай вайны і тое, які след яна пакінула ў душы чалавека.

**Асноўная частка.** Мінулая вайна застаецца вядучай тэмай у творчасці А. Савіцкага. Яго апублікаваныя ў 80-я гады раманы «Літасці не чакай» (1982), «Памерці заўсёды паспееш» (1983) падкрэсліваюць асабліва трагічнае становішча чалавека на вайне. У сваіх раманах «Зямля не раскажа» (1980), «Верасы» (1987) і «Обаль» (1989) пісьменнік звярнуўся да тэмы беларускіх партызан, жыцця людзей горада і вёскі на акупіраванай тэрыторыі.

Раман А. Савіцкага «Обаль» − гэта менавіта той раман, які можа адразу прыцягнуць увагу чытача сваім жыццесцвярджальным гуманістычным пафасам, вастрынёю духоўных, маральных і ідэйных праблем. У «Обалі» сюжэт будуецца на матэрыяле аб маленькай вёсцы з невялікай колькасцю людзей, між тым пытанні, якія ставіць пісьменнік у гэтым творы, набываюць агульначалавечую вартасць міжнацыянальнага ўзроўня. Гэта раман агульначалавечы па сваім духу, па сваёй жыццёвай філасофіі. Выбар шляху, вызначэнне пазіцыі, сцвярджэнне сябе ў вострыя, экстрэмальныя моманты свайго жыцця і гісторыі складаюць асноўную сутнасць рамана А. Савіцкага «Обаль».

Обаль − гэта невялікая вёсачка на Віцебшчыне, з якой пісьменнік знаёміць чытача на пачатку лета сорак першага года, калі чырвоная армія толькі што была вымушана адступіць, і на акупаваных тэрыторыях абасноўваліся нямецкія ўлады. Здаецца, што тут глыбокага і маштабнага, калі ўсе падзеі адбываюцца на невялікім кавалачку тэрыторыі: да бліжэйшых вёсак пешшу няшмат часу і да Полацка рукой падаць, але ў той жа час гэта раман з вельмі ёмістым ахватам падзей.

Звяртаючыся да рамана «Обаль», варта адзначыць, што любы дакументальна-мастацкі раман, не кажучы ўжо пра традыцыйны раман, − гэта не толькі твор дзеяння, але і характараў, таму пра вартасці яго трэба гаварыць зыходзячы з таго, як гэтыя характары раскрыты, наколькі глыбока пісьменнік пранікае ў сутнасць паводзін пэўнага персанажа, паказваючы яго ў развіцці, у дынаміцы [7, с. 176]. У рамане А. Савіцкага можна сустрэць шмат глыбокіх і яскравых вобразаў, прычым пісьменнік звяртаецца не толькі да характараў маладых падпольшчыкаў, партызан ці простых жыхароў, але і да прадстаўнікоў акупацыйных улад і мясцовых здраднікаў-калабарантаў.

Ва ўвасабленні сваіх герояў пісьменнік хоча данесці, што вайна не бывае выбарачнай, маўляў, тут ваююць, а тут можна і перасядзець. Па-першае, яна можа ўварвацца ўсюды, нават на гэты маленькі лапік зямлі, і ад яе нельга схавацца. І кожнаму чалавеку ўсяму прыходзіцца вучыцца нанова, бо таго, што было да вайны, больш няма. Галоўная гераіня Фруза Зянькова, кіраўнік падполля маладых обальскіх падпольшчыкаў, разумее гэта ў першы ж месяц вайны, калі не паспявае эвакуіравацца на ўсход і вяртаецца ў родную вёску: *Ёй нечакана дужа выразна, як ніколі раней за ўсе дні вандровак па прыфрантавых дарогах, адкрылася горкая і суровая ісціна, пра якую тады, у абкоме, ішла говорка: на падказкі, галубачка, не спадзявайся. Ніхто не прыбяжыць да цябе, не раскажа, што трэба рабіць, не павядзе за ручку да дарогі, на якой няма выбоін, на якой толькі ружы і весялосць. Вучыць жыццё будзе гэтак, як вучыў цябе фашыст – бізуном* [8, с. 13].

Па-другое, вайна закранае ўсіх: сталых, маладых, хворых, індыферэнтных. Вайна, якой бы жахлівай яна ні была, гэта і лакмусавая паперка чалавека. Вайна прапануе такія абставіны, у якіх чалавек можа праявіць такія свае чалавечыя якасці, аб наяўнасці якіх у мірным жыцці ніхто бы мог і не здагадацца. Вельмі трапна гэта заўважыў А. Марціновіч, падкрэсліваючы, што «...вайну вялі тыя, хто ў паўсядзённым жыцці быў непрыкметным і толькі ў хвіліну небяспекі адчуў і сваю асабістую адказнасць, зразумеў, што паняцце грамадзянскага і чыста чалавечага абавязку не дэкларуецца гучнымі словамі, а

даказваецца на справах» [9, с. 200]. На вайне адбываецца выяўленне чалавечай сутнасці, ідэйных і маральных асноў, сфармаваных у даваенны час. У гэтым сэнсе вайна – працяг мірнага жыцця чалавека ў іншых, абвостраных умовах, суровая праверка яго сацыяльных якасцяў (пераклад наш. – *М.К.*) [10, с. 7]. Па тых намаганнях, якія чалавек будзе прыкладаць, каб дасягнуць сваёй мэты, па яго свядомасці, волі і духоўнаму ўздыму можна будзе разважаць аб ступені гераічнага ў чалавеку.

Фруза Зянькова не раз ставіцца пісьменнікам перад выбарам: яна вымушана рызыкаваць сабою ці сваімі блізкімі, сябрамі, і кожны раз гэта мусіць быць новы і цяжкі выбар, быццам праверка таго, што чалавек можа зрабіць яшчэ больш, чым раней. Для гераіні гэта не ў першыню, яна – камсорг фабрычный ячэйкі, яна і да вайны мусіла быць моцнай і ўпэўненай у сабе. А. Савіцкі добра разумее чалавечую душу і падкрэслівае, што галоўная каштоўнасць для чалавека– воля. Людзі, аднак, па меркаванні І. Саверчанкі, па-сапраўднаму пачынаюць гэта цаніць толькі тады, калі адчуюць цяжар няволі, прыгнёту і рабства, апынуўшыся пад варожым ярмом [11]. Між тым, ваеннае станаўленне Фрузы Зяньковай як мужнага і вытрыманага чалавека з’яўляецца сцвярджэннем пісьменніка, што гераізм і патрыятызм не ўзнікаюць на пустым месцы. Героямі не нараджаюцца, імі становяцца.

С першых дзён, як Фруза Зянькова вяртаецца ў бацькоўскую хату, не паспеўшы эвакуіравацца разам са сваім віцебскім заводам, яна вымушана змяняцца і вучыцца па-новаму ўспрымаць свет. Бо гэта ўжо не даваенныя часы мірнага камсамольскага будавання. Гэта цяжкія часы, якія выяўляюць у чалавеку яго сапраўдныя якасці. Сваю галоўную гераіню пісьменнік надзяляе моцнай рысай уяўлення таго, што дрэнна, а што добра. Фруза Зянькова для сябе безпамылкова можа ўявіць, што справядлівае і несправядлівае, правільнае і няправільнае. На працягу ўсяго твора гэта перамяжоўваецца з амаль што прастатой і наіўнасцю. Такі аўтарскі падыход можна растлумачыць глыбокім уплывам на літаратуру нацыянальнай традыцыі. Аб гэтым разважае В. Каваленка, калі піша пра героя, які з’явіўся ў беларускай літаратуры ў 60-я гады: «Па той прычыне, што развіццё беларускай грамадскай свядомасці знаходзілася ў вялікай залежнасці ад духоўнага абуджэння сялян, галоўным героем беларускай літаратуры на працягу стагоддзяў быў селянін, але не ўсялякі, а той, што здольны да пазнання свету, да інтэнсіўнага маральнага самаўдасканалення. Галоўны герой літаратуры знешне быў просты, не выдзяляўся з масы, але ў душы выношваў пэўныя маральныя прынцыпы і цвёрда іх трымаўся» (пераклад наш. – *М.К.*) [12, с. 130]. І такім яскравым прадстаўнікам народа з’яўляецца Фруза Зянькова. Знешне простая дзяўчына жыве па сваіх востра справядлівых маральных прынцыпах, якія ёй часам вельмі цяжка парушыць. І толькі мудрасць і вытрымка старэйшых: бацькі, кіраўнікоў партызанскага руху Сіпко, Германа, Маркіянава − дапамагаюць ёй не загінуць у першай жа сутычцы з акупантамі і сфарміравацца як паўнавартаснаму чалавеку, падпольшчыку і грамадзяніну.

Галоўная гераіня, як і ўся обальская моладзь, палае жаданнем змагацца і перамагаць. Фруза храбрая дзяўчына, якая гатова не раздумваючы смела кідацца ў бой з ворагам. Яна, нават, часам баіцца паказацца баязлівай і з гэтага можа дзейнічаць спешна і неабдуманна. Яе дэвіз − «лепш памерці стоячы, чым жыць на каленях». Таму адзін з кіраўнікоў партызанскага атраду Сіпко і вымушаны час ад часу крытыкаваць Фрузу за паспешнасць учынкаў: *Рызыка, рызыка... На першае месца ты павінна развагу ставіць. Развагі не было, калі гранату ў акно каменданту кідалі. І голая рызыка была ў тупіку, ля тых вагонаў... Выправілі на неба вартавога, прыдбалі карабін. А вынік? Карабін бельгійскі, патронаў да яго дзе ўзяць? А мурашнік фрыцаўскі разварушылі, яны цяпер варту падвоілі. І ў нашай баявой дзейнасці шмат чаго ўскладнілася з таго. І вам не лягчэй* [8, с. 148].

Справядліва адзначыць, што прыгажосць і карысць гераічнага ўчынку можа адрознівацца. Сапраўдная адвага не ў адхіленні ад усіх нармальных чалавечых пачуццяў і перажыванняў. Не заўсёды той, хто нічога не баіцца і на злом галавы кідаецца ў бой, носьбіт доблесці. Мера гераізму не вызначаецца ступенню перажыванняў чалавека пры здзяйсненні подзвігу. Важны вынік гэтага подзвігу, якасць яго выканання (пераклад наш. – *М.К.*) [10, с. 10]. З такім абвостраным пачуццём гераізму і справядлівасці выходзяць на прастор барацьбы з ворагам Фруза Зянькова і дзесятак іншых маладых падпольшчыкаў: брат Мікола, Зіна Партнова, Ніна Азоліна, браты Езавітавы, Марыля Дзяменцьева. Кожны з іх у той ці іншай ступені зрабіўся іншым чалавекам.

А. Савіцкі не проста так звярнуўся да тэматыкі партызанскай дзейнасці і вясковага падполля. «Ваенная» і «вясковая» проза − розныя галіны літаратуры, асабліва магутныя на дрэве нашай сучаснай літаратуры, не толькі зблізіліся, але і зрасліся ў адну» (пераклад наш. – *М.К.*) [13, с. 154]. Гэта не новы прыём паказваць вайну вачамі цывільнага чалавека ці простага селяніна, але вельмі істотны. Праз погляд неваеннага, праз кропку погляду звычайнага чалавека з яго жыццёвымі нормамі маралі, можна значна грунтоўней і глыбей паказаць трагічнасць і дзікасць такой з’явы, як вайна. Што датычыцца звычайнага салдата, тут усё зразумела: ёсць загад, ёсць фронт, ёсць вораг, яго можна ўбачыць. Але на акупаванай тэрыторыі няма лініі фронту, фронт можа быць паўсюль. Нават неваенны чалавек вымушаны ў большай ці меншай ступені прымаць удзел у баявых дзеяннях. Як вынік узнікае глыбока псіхалагічная праблема – як чалавек можа застацца самім сабою ва ўмовах вайны.

Такім чынам, паўстае яшчэ адна з важных тэм рамана: пытанне «свой-чужы», калі «свае», як магло стацца, аказваліся не лепш за акупантаў. Чаму паліцаяў Экерта і Крывёнка чытач адразу бачыць як негатыўныя вобразы, між тым некаторых герояў рамана вельмі цяжка адразу асудзіць за супрацоўніцтва з акупантамі. Сам А. Савіцкі сцвярджаў, як няпроста пранікнуць у душу чалавека, асабліва, калі гэты чалавек стаіць на парозе выбару: «Перадаць глыбіню пачуццяў, як складваецца характар чалавека, як ён робіцца мужным – гэта настолькі вялізная і глыбінная духоўная праца, калі чалавек прыходзіць да думкі, што інакш ён не можа, а вось павінен зрабіць так» [14, с. 136]. Ва ўмовах акупацыі, каб выжыць, чалавек вымушаны жыць двайным жыццём, часам мець два твары. Гэта палажэнне не можа зразумець Фруза Зянькова, калі сустракае на вакзале сваю сяброўку Ніну Азоліну, якая ішле паветраныя пацалункі нямецкаму афіцэру, а пра сябе праклінае яго. «*Фруза са здзіўленнем паглядзела на сяброўку, потым прамовіла, ня ведаючы, як паставіцца да гэтай нечаканай стрэчы, і да таго, што давялося ўбачыць і пачуць.*

*− Спачатку пацалункі, потым − праклёны… Дзе тут праўда?*

*− Тут спектакль… Сны мінулі, Фрузачка. Я хоць і маладзейшая за цябе, але до-обра гэта зразумела. Цяпер жыццё вакол нас, крывавае і жорсткае жыццё. Барацьба на выжыванне: ці яны нас у магілу, ці мы іх!* [8, с. 54]».

Фруза не можа сябе ўявіць, як чалавек можа працаваць на акупантаў, і толькі праз цяжкія душэўныя перажыванні яна бачыць, чаму Ніна ці яе бацька працуюць на немцаў. Дзеля дасягнення агульнай мэты даводзіцца прыхаваць свой гонар і злосць на ворага, калі няма сілы тут і зараз перамагчы. Адзін мусіць знішчаць варожых салдат і будынкі, але ж іншаму трэба папрацаваць на так званы новы акупацыйны парадак, каб разбураць яго не толькі знешне, а і знутры. У дадатак, немцы актыўна вывозілі моладзь на працу ў Германію, таму для падпольшчыка вельмі важна было ўладкавацца на месцы, каб працягваць сваю барацьбу. Гэта пачынае разумець і Фруза, якая пазней сама будзе вымушана працаваць у нямецкай камендатуры.

Нездарма А. Савіцкі пачынае свой раман з першапачатковага этапа вайны, калі перад людзьмі асабліва востра паўсталі пытанні «Што рабіць?» і «Кім быць?». На старонках свайго рамана пісьменнік не хоча ідэалізаваць партызанскі рух і чалавека ўвогуле. Вайна можа быць сродкам раскрыцця сапраўднага чалавечага твару, а таму і сярод падпольшчыкаў знойдуцца тыя, хто забаіцца і здрадзіць сваім (на прыкладзе Грахоўскага, з-за здрады якога было разбіта Абалянскае падполле). Той жа начальнік паліцыі Экерт і да вайны быў злыднем, калі яшчэ працаваў трактарыстам. Таму яму нічога не перашкаджала першым пабегчы і запісацца ў паліцыю. Былі і такія, хто не супрацоўнічаў з акупантамі, але ўсё роўна займалі варожую пазіцыю да свайго ж народу: незнаёмы чалавек Генадзь з Полацака, з якім Фруза знаёміцца на руінах мясцовай крамы, быццам Воланд-спакусіцель, прапаноўвае ёй разам з ім адкапаць завалены склад і падзяліць усё дзяржаўнае дабро, якое там заставалася, бо гаспадара няма, а немцы даведаюцца − забяруць. Пісьменнік нібы правярае Фрузу на трываласць, ці здолее тая ўстаяць перад спакусай і сысці са шляху адказнасці і сумлення. На самой справе гэта не было рэдкасцю для тых гадоў, і Фруза са здзіўленнем заўважае, што сустракаецца з такім ужо не першы раз: *Ён, гэты круглатвары дзяцюк, звычайны рабаўнік. Хіба не памятаеш выпадкі, з якімі даводзілася сутыкнуцца ў Віцебску, калі фронт шчэ быў далёка ад горада? Адны пажары тушылі, другія людзей ратавалі, а той-сёй у крамы лез, каб уласную кішэню напакаваць. Відаць нешта ёсць у чалавечай душы вялікае і неспазнанае, што анікому шчэ растлумачыць і спасцігнуць не давялося* [8, с. 83]. Нездарма кажуць людзі: «каму вайна, а каму і маці родна». Але гэтае нешта «неспазнанае» на практыцы аказваецца звычайнай баязлівасцю і абыякавасцю да ўсяго на свеце, і такіх людзей А. Савіцкі не можа назваць сапраўдным чалавекам.

Хочацца адзначыць, што аўтар паказвае перыяд акупацыі Беларусі не ў адрыве ад агульных падзей вайны, а ва ўскоснай сувязі з імі. Усесаюзную барацьбу пісьменнік паказвае не праз сухую інфармацыйную зводку, а больш «народным» спосабам: праз чуткі, плёткі, абрыўкі газет і аповедаў сведкаў, але такім чынам інфармацыя і трапляла да людзей на акупаваных тэрыторыях. Вось вясёлыя нямецкія салдаты, распяваючы песні пра Маскву, ляцяць у цягніках на ўсход, што дае разуменне, які зараз месяц, і куды накіроўваюцца нямецкія цягнікі. А вось прыходзіць зіма, і ў нямецкага кіраўніцтва і калабарантаў знікае настрой, і ў народзе адразу паўзуць чуткі, што разбіты быў немец пад сталіцай. Ад немцаў, гарлапанячых у сталовай «Вольга-Вольга, руссіш мутэр», можна даведацца, што, маўляў, выйшла армія Паўлюса да Сталінграду. А пазней зімой, пасля замаху на жыццё каменданта Карла Бормана, падпольшчыкі заўважаюць, што назва гэтага горада знікла з нямецкіх размоў. Такі прыём стварае атмасферу прысутнасці, дапамагае чытачу яшчэ глыбей пранікнуцца часам і падзеямі, нібы апынуўшыся ў тых гадах.

У беларускай ваеннай прозе трагедыя вайны заўсёды ішла побач з адлюстраваннем вобраза ворага. Асаблівая ўвага да знешняга аблічча і ўнутранага складу нямецкага салдата пачала надавацца яшчэ ў творах другой паловы 50-х гадоў. Зацікаўленасць гэтай тэмай не слабела ў ваеннай прозе раней і з’яўляецца актуальнай і ў нашы дні. У творах беларускіх пісьменнікаў, пачынаючы з твораў К. Чорнага і

М. Лынькова, можна прасачыць тэндэнцыю вылучэння сустрэчы чалавека з нямецкім салдатам. Гэта вобраз менавіта аднаго асобнага нямецкага салдата. Такі прыём можна тлумачыць тым, што ў асяроддзі іншых чалавек часта паддаецца настрою тых, хто яго акружае і можа не выявіць сваю сапраўдную сутнасць. Іншая справа, калі ён адзін. У такой сітуацыі ён маральна «голы». І гэта каштоўна, паколькі дазваляе меркаваць аб маральным абліччы ўсёй арміі (пераклад наш. – *М.К.*) [2, с. 88]. Не цяжка здагадацца, што такі прыём таксама дапамагае больш выразна падкрэсліць характар станоўчага героя. Гераізм не ўзнікае на пустым месцы, і герой мусіць ведаць з якім ворагам ён змагаецца, бо пераадоленне ворага і ёсць мэта гераізму. А для гэтага чалавеку трэба зразумець, што вораг, якім бы моцным ён не ўяўляўся на першы погляд, таксама мае слабыя бакі. Раскрыццё характару ворага дапамагае атрымаць маральную перамогу над захопнікам, узмацняее асэнсаванне асабістых учынкаў і абуджае пачуццё справядлівага змагання.

Няцяжка заўважыць, што А. Савіцкі таксама звяртаецца да адзіночнага вобраза немца, каб больш поўна раскрыць кантраст паміж тым, што адбывалася ў душы беларусаў і немцаў. Пісьменнік праз сваіх герояў хоча зразумець усю праўду і знайсці тую глебу, на якой «растуць атрутныя расліны жорсткасці і катаўскай паслухмянасці фашысцкай дактрыне» (пераклад наш. – *М.К.*) [13, с. 37]. Фруза сустракае сталага салдата ў цягніку, які адразу паказаў дзяўчыне, хто яна і хто ён. Унутраны свет акупанта пісьменнік раскрывае яго напышлівымі паводзінамі, фанабэрыстасцю перад дзяўчынай. Момант, калі салдат скрупулёзна і нетаропка пералічыў яйкі, якія ён адабраў у Фрузы, раскрывае дзяўчыне ўвесь унутраны свет акупанта. Вораг прыйшоў не проста як салдат чужой арміі, её прыйшоў як гаспадар гэтай зямлі з мэтай набраць паболей яек. А каштоўнасць чалавечай падзякі вораг прагматычна ацэньвае ў адну рэйхс-марку, якую ён марудна працягнуў Фрузе, быццам падачку. Здаецца, гэта дробная сітуацыя, але А. Савіцкі ўклаў у яе глыбокі маральна-ацэначны падтэкст. Гэтая сустрэча канчаткова пераконвае Фрузу Зянькову ў правільным выбары, які яна зрабіла: не эвакуіравацца разам са сваім заводам, а вярнуцца ў вёску і змагацца на роднай зямлі.

Цяжкасці ваеннага часу А. Савіцкі пераасэнсоўвае не толькі праз прызму гераічнага і партызанскую барацьбу, але і праз трагічнасць кахання. Жыццё ёсць жыццё, і, нават, у грозныя ваенныя гады ёсць месца вялікаму чалавечаму каханню [15, с. 132]. Гэтае пачуццё для пісьменніка з’яўляецца ўвасабленнем усяго самага светлага, чыстага, прыгожага. Фруза страціла Сяргея напачатку вайны, але ў хуткім часё яго, параненага, знаходзіць яе сяброўка Марыля, якая таксама пачынае нешта адчуваць да салдата. Для А. Савіцкага гераізм − гэта форма праяўлення кахання. Чалавек можа быць здольны на подзвіг тады, калі ён ясна ўяўляе сабе мэту свайго ўчынка, а каханне ўяўляецца пісьменнікам як адна з крыніц маральнага ўзбраення чалавека, якая дапамагае яму выстаяць і зрабіць правільны выбар. Каханне можа натхніць чалавека перасягнуць свае фізічныя, псіхічныя і духоўныя магчымасці і здзейсніць гераічны ўчынак. Гераізм, абуджаны каханнем, праўляецца ў сцэне развітання Зяньковай з закатаваным на цэнтральнай плошчы Сяргеем. Гэта безумоўна найбольш глыбокі і трагічны момант ва ўсім творы. Здаецца, калі памірае каханы чалавек, уся чалавечая прырода патрабуе развітацца з ім належным чынам. Але ідзе вайна і нават у горы галоўная гераіня вымушана хаваць унутры сябе свае слёзы, каб не правaліць агульную справу, каб не быць арыштаванай: *Галоўнае каб ніхто не прачытаў на яе твары тугі і адчаю. Але ж як ты пракантралюеш выраз твару, куды вочы схаваеш?... Не, тут адзінае можа ўратаваць – смеласць і незалежнасць* [8, с. 208]. Спалучэнне такой глыбокай экспрэсіўнасці, напружанасці і разважанняў пры імгненным развіцці падзей надае гэтай сцэне вялікую ступень трагічнасці і адначасова гераічнасці.

У рамане А. Савіцкага гэтае каханне фонам праходзіць амаль праз усю кнігу, быццам падкрэсліваючы, што на самой справе кіруе ўсім у свеце. І гэтае сапраўднае каханне нібы дапамагае Фрузе не разгубіцца перад паліцэйскім, што вартаваў забітых, і не выдаць яму свой боль і роспач: *Фрузе раптам захацелася кінуцца назад, падбегчы да старога клёна, разадраць тыя гузавыя вяроўкі, адкінуць сукаваты аполак, прыцісунуцца да Сяргейкі і загаласіць на ўвесь белы свет. Але яна не спынілася, не змяніла паставы, упарта ішла і ішла далей* [8, с. 211]. Гераіня здолела не выдаць сваіх пачуццяў, і гэтым атрымала яшчэ адну асабістую перамогу над сабою і над ворагам. Гэтая перамога падкрэсліваеца тым, што Вялікая Айчынная вайна пры сваіх вялізарных памерах разбурэння і вынішчэння была па свайму характару вайной гуманістычнай і ў гэтым няма супярэчнасці. У пісьменніка-гуманіста воін, паглынуты боем, знаходзячыся на грані жыцця і смерці, усё ж шукае праз сябе адказы на агульначалавечыя пытанні, працягваючы з яшчэ болей абвостранай праніклівасцю спасцігаць сэнс жыцця (пераклад наш. – *М.К.*) [2, с. 77]. Гераічнасць чалавека, па меркаванні А. Савіцкага, гэта не якасць, якая даецца чалавеку ад нараджэння і не велічыня, якую можна вымераць нейкімі меркамі. Свой асабісты гераізм кожны чалавек выхоўвае ў сабе сам, на шляху цяжкіх разваг і пошукаў. Нават калі гераічны ўчынак з’яўляецца чымсьці раптоўным і нечаканым, вытокі яго знаходзяцца глыбока ўнутры чалавека і выяўляюцца пасля моцнай і сур’ёзнай барацьбы, перш за ўсё, з самім сабою.

**Заключэнне.** А. Савіцкі не гіпербалізуе вобразы ўдзельнікаў падполля, надзяляючы іх рыцарскімі рысамі, наадварот, пісьменнік адзначае супярэчнасць чалавечай натуры і яе недахопы: узбунтаванне супраць вайны і патрыятычны ўздым цесна пераплятаюцца з няўпэўненасцю, баязлівасцю, безадказнасцю і нават здрадай. Праз паступовае развіццё характараў Фрузы Зяньковай і яе асяроддзя пад уплывам жосткіх абставінаў пісьменнік раскрывае ўсю прыроду гераізму, які з'яўляецца вынікам вышэйшага ўсведамлення маральнасці чалавека. Праблема выбару ставіцца як праблема сумленнага абавязку чалавека. Сапраўдны гераізм мае свае вытокі ў свядомасці чалавека, у яго здольнасці дакладна вызначаць для сябе мэты, прымаць адказнасць за свае учынкі і перамагаць слабасці. Паглыбляючыся ў псіхалогію чалавека, А. Савіцкі вырашае сваю мастацкую задачу стварэння нязломнага гераічнага вобраза чалавека, што прайшоў цяжкія выпрабаванні на шляху фарміравання сябе як сапраўднага грамадзяніна і патрыёта.

*Паступіў 16.10.2015*

ЛІТАРАТУРА

1. Тычына, М. Змена квадры. Літаратурна-крытычныя артыкулы / М. Тычына. − Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. − 203 с.
2. Коваленко, В. Литература о войне  и проблемы века / В. Коваленко. – Минск : Наука и техника, 1986. − 271 с.
3. Андраюк, С. А. Жыццё. Літаратура. Героі. / С. А. Андраюк. − Мінск : Навука і тэхніка, 1973. − 175 с.
4. Адамович, А. Додумывать до конца / А. Адамович. − Минск : Советский писатель, 1988. − 491 с.
5. Локун, В. І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гады. / В. І. Локун. − Мінск : Навука і тэхніка, 1995. − 109 с.
6. Дзюбайла, П. К. Станоўчы герой беларускай літаратуры / П. К. Дзюбайла. − Мінск : Народная асвета, 1990. − 224 с.
7. На вайне як на вайне / А. Марціновіч [і інш.] // Полымя. − 2014. − № 7. − С. 174–177
8. Савіцкі, А. Обаль / А. Савіцкі. – Мінск : Выдавецкі дом "Звязда", 2013. − 464 с.
9. Марціновіч, А. Сувязь: Літ.-крытыч. арт. / А. Марціновіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. − 253 с.
10. Ломидзе, Г. Нравственные истоки подвига: Советская литература и Великая Отечественная война / Г. Ломидзе. − М. : Советский писатель, 1985. − 208 с.
11. Саверчанка, І. Бераг родны Абалянкі / І. Саверчанка // Звязда. − 2013. – 20 ліст. – С. 6.
12. Коваленко, В. А. Общность судеб и сердец / В. А. Коваленко. – Минск : Наука и техника, 1985. − 351 с.
13. Адамович, А. Ничего важнее: Современные проблемы военной прозы / А. Адамович. − М. : Советский писатель, 1985. – 288 с.
14. Урок мужнасці. Школьныя далягляды / А. Савіцкі [і інш.] // Полымя. − 2011. − № 5. − С. 135–149.
15. Сліва, М. Найвышэйшае і светлае: пісьменнікі і іх героі / М. Сліва – Мінск : Кнігазбор, 2008. − 148 с.

*Паступіў 20.10.2015*

## NO ONE IS BORN A HERO: THE MANIFESTATION OF HEROISM IN A. SAVITSKY'S «OBAL»

***M. KOURIPKA***

*In the novel «Obal» A. Savitsky turns to self-sacrificing struggle of the Young Avengers organization during the Great Patriotic war. The fight and sacrifice help the writer to seek the origins of heroism of young people who rose in arms against fascism. The author examines people's characters with deep psychological analysis, reasoning that they start to think much of their lives in pain, despair and oppression in particular. A. Savitsky uses different artistic means to show a realistic and true war, which makes it possible to reveal the roots of heroism under extreme circumstances.*

***Keywords:*** *Heroism, the Great Patriotic War, Belarusian literature, hero, war novel.*